# Пра Супершчыт і правілы бяспекі

Ніхто не любіць непрыемнасці. Але супергероі добра ведаюць: да прыгод трэба быць гатовымі, бо нешта можа пайсці не так, як было задумана. Не, чакаць непрыемнасцей не трэба, наадварот, лепш настройвацца на лепшае ☺



У кожнага героя ёсць нешта асаблівае: у кагосьці — магічная палачка ці суперкасцюм, нейкая звышздольнасць, а ў кагосьці — магутны шчыт.

Дык вось, у нашы дні ў сучасных сем'яў таксама можа быць свой «супершчыт» — страхоўка або, іншымі словамі, страхавы поліс.

## Што гэта значыць?






Калі з чалавекам раптоўна здараецца непрыемнасць, яму можа спатрэбіцца дапамога, у тым ліку **медычная або грашовая**. У выпадку з выбітым шклом неабходна ўставіць новае. А калі паслізнуўся на лесвіцы і зламаў нагу, трэба не толькі абследавацца ў бальніцы. Пасля зняцця гіпсу ўрач можа параіць адпачыць яшчэ нейкі час у санаторыі.



**А яшчэ ёсць страхоўка, якая можа дапамагчы хатнім гадаванцам. Калі з жывёлай нешта здарыцца, яна:**

- пакрые выдаткі на лячэнне (лекі, аперацыя). Гэта важна і пры выпадковых атручваннях*, бо гадаванцы любяць спрабаваць усё, што ім трапіцца, на смак, а гэта не карысна для іх страўніка*. І таксама калі ўкусіць клешч ці змяя, якія актывізуюцца ўлетку на прыродзе;




- дапаможа выправіць наступствы шкодніцтва гадаванцаў. Напрыклад, калі ваш сабака з радасці парве чужую куртку, разаб'е суседскую вазу ці падрапае нечы аўтамабіль, страхоўка кампенсуе страты.




Калі з чалавекам раптоўна здараецца непрыемнасць, яму можа спатрэбіцца дапамога, у тым ліку **медычная або грашовая**. У выпадку з выбітым шклом неабходна ўставіць новае. А калі паслізнуўся на лесвіцы і зламаў нагу, трэба не толькі абследавацца ў бальніцы. Пасля зняцця гіпсу ўрач можа параіць адпачыць яшчэ нейкі час у санаторыі.



**А яшчэ ёсць страхоўка, якая можа дапамагчы хатнім гадаванцам. Калі з жывёлай нешта здарыцца, яна:**

- пакрые выдаткі на лячэнне (лекі, аперацыя). Гэта важна і пры выпадковых атручваннях*, бо гадаванцы любяць спрабаваць усё, што ім трапіцца, на смак, а гэта не карысна для іх страўніка*. І таксама калі ўкусіць клешч ці змея, якія актывізуюцца ўлетку на прыродзе;




- дапаможа выправіць наступствы шкодніцтва гадаванцаў. Напрыклад, калі ваш сабака з радасці парве чужую куртку, разаб'е суседскую вазу ці падрапае нечы аўтамабіль, страхоўка кампенсуе страты.